ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
19.11.2020 № 283

# Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Беларускі музычны фальклор» для X–XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі

# ГЛАВА І
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Беларускі музычны фальклор» (далей – вучэбная праграма) распрацавана для вучняў X–XI класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

2. На вывучэнне дадзенай вучэбнай праграмы факультатыўных заняткаў у X–XI класах адводзіцца 210 гадзін (па 105 гадзін у кожным класе, 3 гадзіны на тыдзень).

3. Мэта – стварэнне этнакультурнага вобраза беларусаў у свядомасці вучняў сродкамі музычнага фальклору.

4. Задачы:

развіць устойлівую цікавасць да фальклору;

пашырыць сістэму ведаў пра законы і прынцыпы змены сезонаў і ўплыў гэтых зменаў на традыцыйнае мастацтва;

сфарміраваць уменне вызначаць асноўную ідэю (напрамак) свят, абрадаў і звычаяў беларусаў; знаходзіць «форму» падачы фальклорнага твора ў адпаведнасці з яго сезонам, выкарыстоўваючы неабходныя фальклорныя прыёмы і сродкі; выконваць песні, гульні і побытавыя танцы;

сфарміраваць навыкі ўспрымання тэксту і лексікі нескладаных песень, гульняў і побытавых танцаў;

сфарміраваць навыкі харавога музіцыравання з суправаджэннем, харавога калектыўнага музіцыраваня з харэаграфічнымі рухамі;

развіваць навыкі харавога калектыўнага музіцыравання.

5. Дадзеная вучэбная праграма знаёміць вучняў з такімі прынцыпамі фальклорнага мастацтва, як яго сістэмная этнаэкалагічнасць (сувязь з прыроднымі цыкламі і біярытмамі ў «матчыным» ландшафце этнасу), вусная перадача і дакументальная аснова народнай творчасці. Каб пазбегнуць штучнасці і недакладнасці ў вучэбным рэпертуары, дыдактычны змест кожнай з тэм праграмы (асабліва, калі гэта неабходна) распісаны парэгіянальна. Аднак творы, якія рэкамендуюцца, не абавязковыя, пры жаданні іх можна замяняць мясцовым рэпертуарам, запісаным ці перанятым ад носьбітаў рэгіянальнай традыцыі.

Практычная праца накіравана на арганічнасць успрымання тэксту і лексікі нескладаных песень, гульняў і побытавых танцаў. Па магчымасці рэкамендуецца арганізоўваць экскурсіі ў этнаграфічныя экспазіцыі краязнаўчых музеяў (у гарадскіх умовах) ці сустрэчы з носьбітамі традыцыі (у вёсцы) для знаёмства з артэфактамі традыцыйнай культуры і мясцовымі носьбітамі фальклору.

6. Асноўныя патрабаванні да вынікаў засваення зместу вучэбнага матэрыялу выяўляюцца ў тым, што ў вучняў будуць сфарміраваны:

6.1. уяўленні аб законах і прынцыпах змены сезонаў і ўплыву гэтых зменаў на фальклорнае мастацтва беларусаў;

6.2. веды аб спосабах стварэння этнакультурнага вобраза беларусаў сродкамі фальклорнага мастацтва; парадак працы над сезонным фальклорным творчым праектам;

6.3. уменні вызначаць асноўную ідэю свят, абрадаў і звычаяў беларусаў; успрымаць тэкст і лексіку нескладаных песень, гульняў і побытавых танцаў; знаходзіць «форму» падачы твора ў адпаведнасці з яго сезоннасцю з мэтай стварэння этнакультурнага вобраза беларусаў, выкарыстоўваючы неабходныя фальклорныя прыёмы і сродкі.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### X КЛАС (105 гадзін)

### Фальклорнае мастацтва восені (26 гадзін)

#### Побытавы танец на восеньскіх кірмашах і фэстах Беларусі (3 гадзіны)

Восень як час, які надыходзіць пасля гарачыні лета, калі Сонцу па народных уяўленнях трэба адпачыць, набрацца сіл; дні становяцца карацейшымі, а ночы падаўжаюцца. Сканчэнне працы па ўборцы ўраджаю, калі народ у вёсках і мястэчках Беларусі пачынаў весела і няспешна адпачываць. Час, калі людзі збіраліся разам, каб паслухаць музыку, спявалі і танчылі на кірмашах і святах ураджаю. Адлюстраванне рэкрэацыйнага і разняволенага настрою ў восеньскім фальклорным рэпертуары.

Побытавыя танцы «Базар» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Дзева ў сенях стаяла» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Базар» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Даўжок» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Мільён» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Шарлатан» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння) як прыклады побытавых танцаў з тэкстамі пра кірмашовы перыяд. Нескладанасць і дэмакратычнасць асноўных рухаў вышэйпералічаных танцаў. Іх развучванне пад інструментальны і спеўны (у запісы) акампанемент.

*Музычны матэрыял:* побытавыя танцы «Базар» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Дзева ў сенях стаяла» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Базар» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Даўжок» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Мільён» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Шарлатан» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Прыпеўкі да побытавага танца (3 гадзіны)

Побытавыя танцы і прыпеўкі да іх з тэкстам пра кірмашовы перыяд. Нескладанасць і дэмакратычнасць асноўных рухаў побытавых танцаў і прыпевак да іх з калектыўным рэфрэнам. Дэкламацыя і спевы па чарзе: «педагог – вучні».

Практыкаванні, у якіх педагог просіць кожнага вучня разам з ім запяваць па чарзе адзін куплет, а падцягваць рэфрэн – усіх. Харавыя дэкламацыі і спевы напеву са словамі прыпевак да абранага рэгіянальнага побытавага танца. Спалучэнне вербальнага тэксту (наступны этап – спеваў) з рухамі.

*Музычны матэрыял:* побытавыя танцы «Базар» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Дзева ў сенях стаяла» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Базар» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Даўжок» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Мільён» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Шарлатан» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Песні-балады восені (3 гадзіны)

Сяляне Беларусі, якія адпачываюць ад летняй працы, і іх восеньскія песні як роздум і назіранне за наваколлем, «перакліканне» з галасамі птушак, якія адляталі, каб іх «не схапілі» халады, у мясціны, дзе круглы год цёпла – на поўдзень. Восеньскія працоўныя песні і песні-балады (агульная характарыстыка).

Рэгіянальныя балады як прыклад восеньскай лірыкі беларусаў. Дэкламацыя і (як наступны этап) спевы тэкста восеньскай песні.

*Музычны матэрыял:* восеньскія песні «Ластаўка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Ты крапіва, ты крапівушка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «У нас сягоння талака» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Ужо восэнь наступае» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «А ці поўна арэхава чашка» (для гісторыка-

этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Ой, валы мае» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Восеньскія песні беларусаў (3 гадзіны)

Восеньскія працоўныя песні (падрабязнае тлумачэнне: песні пры зборы грэчкі, грыбоў, жніве ярыны, працы ў талацэ) і песні-балады.

Дэкламацыя і спевы па чарзе: «педагог – вучні». Практыкаванні, у якіх педагог просіць кожнага вучня разам з ім запяваць па чарзе адзін куплет, а падцягваць рэфрэн – усіх. Выкананне дэкламацыі слоў і напеву рэгіянальнай восеньскай песні. Паўтарэнне прыпевак і рухаў да побытавага танца з папярэдніх заняткаў.

*Музычны матэрыял:* восеньскія песні «Ластаўка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Ты крапіва, ты крапівушка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «У нас сягоння талака» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Ужо восэнь наступае» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «А ці поўна арэхава чашка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Ой, валы мае» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Гульня са спевамі і рытмічнымі рухамі (арнаментальная) у восеньскі перыяд (3 гадзіны)

Восеньскі адпачынак у Піліпаўку (падрабязнае тлумачэнне пра пасты, іх медыцынскі і псіхатэрапеўтычны плён для здароўя), праца і хатнія гульні моладзі (агульная характарыстыка), якія яго суправаджалі.

Выкананне дэкламацыі слоў і напеву рэгіянальнай песні-гульні. Суіснаванне і спалучэнне гульняў з песнямі і побытавым танцам у паводзіннай культуры беларусаў. Паўтарэнне слоў і напеву восеньскай песні, прыпевак і рухаў да побытавага танца з папярэдніх заняткаў.

*Музычны матэрыял:* песні-гульні «Падушачка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Чыбір» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Перапёлка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Молодар» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Мак» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Курачка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Гульня з формульным тэкстам і дыялогамі (драматычная) у восеньскі перыяд (3 гадзіны)

Экалогія восені, калі Сонца пачынае свяціць меней і «прысынае» прыроду, таму, як адзначаюць фальклорныя крыніцы, «жаўцее траўка-

мураўка, явар-кляновы лісток, адлятаюць птушкі. Дні становяцца ўсё карацейшымі. Настае Багач, у які часцяком ладзяць кірмашы». Звесткі пра тое, як на Багач, Міколу па вёсках і мястэчках ладзілі спеўкі і бяседы, дзе песнямі, дудой, скрыпкай і барабанам, іншымі музычнымі інструментамі віталі аднавяскоўцаў. Супольныя бяседы, якіх заўсёды чакалі, таму што яны прыносілі ўсім добры настрой і адпачынак. Піліпаўскі пост і хатнія гульні моладзі (падрабязная характарыстыка: віды працы, гендарная камунікацыя, падрыхтоўка да шлюбу), звязаныя з імі жанры балад і прыпевак да танцаў.

Паўтарэнне слоў і напеву рэгіянальнай восеньскай песні-гульні, слоў і напеву восеньскай песні, прыпевак і рухаў да побытавага танца з папярэдніх заняткаў.

*Музычны матэрыял:* песні-гульні «Падушачка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Чыбір» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Перапёлка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Молодар» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Мак» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Курачка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

### Побытавыя танцы (парныя і з няцотнай колькасцю выканаўцаў) у восеньскіх святах Беларусі (3 гадзіны)

Восеньскія фэсты, кірмашы, звязаныя з імі жанры балад і прыпевак да танцаў. Словы, напеў, харэаграфічныя рухі і інструментальнае суправаджэнне прыпевак да абранага рэгіянальнага побытавага танца.

Выкананне дэкламацыі слоў і напеву прыпевак да абранага рэгіянальнага побытавага танца. Спалучэнне вербальнага тэксту (наступны этап – спеваў) з рухамі. Побытавы танец у спалучэнні з іншымі жанрамі на кірмашах і фэстах. Паўтарэнне слоў і напеву рэгіянальнай восеньскай песні-гульні, слоў і напеву восеньскай песні, прыпевак і рухаў да побытавага танца з папярэдніх заняткаў.

*Музычны матэрыял:* танец «Кракавяк у тройках» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), полька «Нітачка-іголачка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), танец «Картузэ» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), танец «Тэрніця» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), танец «Мяцеліца» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), танец «Акуліна» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

### Побытавы танец з рознай колькасцю выканаўцаў на восеньскіх вячорках (3 гадзіны)

Супольныя танцавальныя вечарыны беларусаў у восеньскі час. Рэпертуар побытавых танцаў беларусаў, іх вялікая (да 500 найменняў) колькасць і шырокая распаўсюджанасць ва ўсіх рэгіёнах краіны. Звесткі пра мясцовыя побытавыя танцы (вёскі, раёна, гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна), музычныя інструменты, якія іх суправаджалі. Знаёмства (фізічнае ці віртуальнае) з мясцовымі майстрамі танцавальнага фальклору і музыкамі-інструменталістамі.

Паўтарэнне прыпевак і рухаў да побытавых танцаў (парнага і з няцотнай колькасцю выканаўцаў) з папярэдніх заняткаў.

*Музычны матэрыял:* танец «Кракавяк у тройках» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), полька «Нітачка-іголачка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), танец «Картузэ» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), танец «Тэрніця» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), танец «Мяцеліца» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Акуліна» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Выніковыя заняткі «Беларускі кірмаш» (2 гадзіны)

Падрыхтоўка і дэманстрацыя на школьным свяце праграмы «Беларускі кірмаш», дзе пра восеньскія звычаі, песні, гульні, танцы распавядае настаўнік, а дэманструюць – вучні, якія вучылі іх на папярэдніх занятках.

Рэпертуарны спіс да раздзела

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі – побытавы танец «Базар», восеньская песня «Ластаўка», песня-гульня «Падушачка», танец «Кракавяк у тройках».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя – побытавы танец «Дзева ў сенях стаяла», восеньская песня «Ты крапіва, ты крапівушка», песня-гульня «Чыбір», полька «Нітачка-іголачка».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся – побытавы танец «Базар», восеньская песня «У нас сягоння талака», песня-гульня «Перапёлка», танец «Картузэ».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся – побытавы танец «Даўжок», восеньская песня «Ужо восэнь наступае», песня-гульня «Молодар», танец «Тэрніця».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння – побытавы танец «Мільён», восеньская песня «А ці поўна арэхава чашка», песня-гульня «Мак», танец «Мяцеліца».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння – побытавы танец «Шарлатан», восеньская песня «Ой, валы мае», песня-гульня «Курачка», танец «Акуліна».

Фальклорнае мастацтва зімы (26 гадзін)

Зімовыя песні і гульні беларусаў (3 гадзіны)

Зіма як час, які надыходзіць пасля восені, калі Сонцу па народных уяўленнях трэба «развярнуцца на лета»; час самых кароткіх дзён і самых доўгіх начэй у годзе – калядных. Часовае «паміранне» прыроды і згасанне прыродных працэсаў пад націскам халадоў. Доўгі Піліпаўскі пост як прэлюдыя зімы, яго хатнія цырымоніі і гульні (характарыстыка ў кантэксце прадчування Калядаў). Адлюстраванне размеранасці і нетаропкасці перадкаляднага сезона ў напевах і рытміцы зімовых гульняў.

Асаблівасці слоў, напеву, харэаграфічных рухаў і інструментальнага суправаджэння абранай рэгіянальнай зімовай гульні. Выкананне дэкламацыі слоў і напеву песні-гульні.

*Музычны матэрыял:* песні-гульні «Грушка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Бусел» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Дуга» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Казёл» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Буцян» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Яшчур» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Песні зімовых ігрышчаў (3 гадзіны)

Перадкалядны час, калі ўзімку Сонца пачынае свяціць значна меней і прырода засынае. Моладзь, якая чакае Каляды і напярэдадні (у Піліпаўку) ладзіць вечарыны, гульні і ігрышчы. Супольныя «попрадкавыя» вечарыны, калі дзяўчаты рыхтавалі пасаг, на якія прыходзілі хлопцы; і якія заўсёды чакалі, таму што яны прыносілі ўсім добры настрой і адпачынак.

Паўтор дэкламацыі слоў і напеву абранай рэгіянальнай песні-гульні.

*Музычны матэрыял:* песні-гульні «Грушка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Бусел» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Дуга» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Казёл» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Буцян» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Яшчур» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

## Песні калядных абыходаў (3 гадзіны)

Каляды як апагей зімовага перыяду, час Крывых вечароў, калі свет карнавалізуецца, Сонца «паварочвае на лета, а зіма – на мароз», звычайны парадак часова адмяняецца, і надыходзяць шумныя і вясёлыя Тры Куцці (прымеркаваныя да Раства – Васілля – Вадохрышча). Адлюстраванне «пераломнасці» сезона ў шумных абыходных песнях-калядках.

Выкананне дэкламацыі слоў і напеву абранай рэгіянальнай калядnай песні.

*Музычны матэрыял:* песні «Прыйшла Каляда» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Ай, калядачкі, вы вярніцеся» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «На вашым дварэ» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Колядо, бэгла колядка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «А ў заенькі тры домухны» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Цераз поле-лес ішла Каляда» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

## Песні-калядкі і песні-шчадроўкі (3 гадзіны)

Варыятыўнасць калядных святкаванняў і песень на Беларусі: Ваджэнне Казы на Падняпроўі і Палессі, Жаніцьба Цярэшкі ў Цэнтральнай Беларусі і на Падзвінні, Тры Каралі на Панямонні. Звесткі пра мясцовыя калядныя песні-шчадроўкі (вёскі, раёна, гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна), адрозненні іх рэфрэна ад каляднага. Знаёмства (фізічнае ці віртуальнае) з мясцовымі майстрамі спеўнага фальклору.

Асаблівасці слоў, напеву, харэаграфічных рухаў і інструментальнага суправаджэння абранай рэгіянальнай песні-шчадроўкі. Выкананне дэкламацыі слоў і напеву песні. Паўтор слоў і напеву абранай рэгіянальнай каляднай песні.

*Музычны матэрыял:* песні «Там на рэчцы на Ярдані» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «За гарою камянною» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Каля коміна» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Хадзіла-блудзіла семсот молайцоў» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Добры вечар вам» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «За варотамі» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

## Песні калядных хатніх цырымоніяў (3 гадзіны)

Хатнія цырымоніі розных рэгіёнаў Беларусі, месца ў іх мясцовай традыцыі. Парадак: месца, удзельнікі і арганізатары цырымоній (агульная

характарыстыка). Асаблівасці іх слоў, напеваў, харэаграфічных рухаў і інструментальнага суправаджэння.

Выкананне дэкламацыі слоў і напеву абранай рэгіянальнай песні-гульні.

*Музычны матэрыял:* песні-гульні «Грушка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Бусел» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Дуга» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), – «Казёл» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Цярэшка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Яшчур» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Калядныя містэрыі беларусаў (3 гадзіны)

Тэатралізаваныя каляндарныя дзеі і іх міфалагічная аснова, якая пераводзіць іх у статус дзей-містэрый. Парадак хатніх цырымоній Цэнтральнай Беларусі і Падзвіння («Цярэшкі»): месца, удзельнікі і арганізатары цырымоній (падрабязная характарыстыка); яго суадносіны з мясцовай традыцыяй.

Паўтор дэкламацыі слоў і напеву абранай рэгіянальнай песні-гульні.

*Музычны матэрыял:* песні-гульні «Грушка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Бусел» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Дуга» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), – «Казёл» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Цярэшка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Яшчур» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Песні калядных містэрый (3 гадзіны)

«Лявоніха» як рытуальны танец калядных хатніх цырымоній Цэнтральнай Беларусі і Падзвіння і прыпеўкі да яе. Яе характарыстыка: музычны памер, парна-гуртавы характар, прыпеўкі пад рухі, смыковы і дударскі акампанемент, суадносіны з мясцовай традыцыяй.

Словы, напеў, харэаграфічныя рухі і інструментальнае суправаджэнне песні «Лявоніха».

*Музычны матэрыял:* прыпеўкі да танца «Лявоніха» (рэгіянальныя варыянты).

Гульні і танцы зімовых свят (3 гадзіны)

Калядны карнавал і актыўныя формы адпачынку, якіх ён вымагае. Гульні і танцы як неад’емная частка гукавай партытуры Калядаў.

Паўтор дэкламацыі слоў і напеву абранай рэгіянальнай калядной песні-гульні, «Лявоніхі», абранай рэгіянальнай песні-калядкі і песні-шчадроўкі.

*Музычны матэрыял:* песні-гульні «Грушка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Бусел» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Дуга» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), – «Казёл» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Цярэшка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Яшчур» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Выніковыя заняткі «Беларускія Каляды» (2 гадзіны)

Падрыхтоўка і дэманстрацыя на школьным свяце праграмы «Беларускія Каляды», дзе пра калядныя звычаі, песні, гульні, танцы распавядаюць (па чарзе) педагог і вучні, а дэманструюць – вучні, якія вывучылі іх на папярэдніх занятках. Замацаванне навыку харавога калектыўнага музіцыраваня з харэаграфічнымі рухамі.

Рэпертуарны спіс да раздзела

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі – песня-гульня «Грушка», калядная песня «Прыйшла Каляда», песня-шчадроўка «Там на рэчцы на Ярдані», прыпеўкі да танца «Лявоніха» (рэгіянальны варыянт).

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя – песня-гульня «Бусел», калядная песня «Ай, калядачкі, вы вярніцеся», песня-шчадроўка «За гарою камянною».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся – песня-гульня «Дуга», калядная песня «На вашым дварэ», песня-шчадроўка «Каля коміна».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся – песня-гульня «Казёл», калядная песня «Колядо, бэгла колядка», песня-шчадроўка «Хадзіла-блудзіла семсот молайцоў».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння – песня-гульня «Буцян», калядная песня «А ў заенькі тры домухны», песня-шчадроўка «Добры вечар вам», песня-гульня «Цярэшка», прыпеўкі да танца «Лявоніха» (рэгіянальны варыянт).

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння – песня-гульня «Яшчур», калядная песня «Цераз поле-лес ішла Каляда», песня-шчадроўка «За варотамі», прыпеўкі да танца «Лявоніха» (рэгіянальны варыянт).

Фальклорнае мастацтва вясны (26 гадзін)

Веснавыя гульні Беларусі (3 гадзіны)

Вясна як час, які надыходзіць пасля зімы, калі Сонца па народных уяўленнях «ідзе да лета»; час доўгіх дзён і кароткіх начэй. «Аднаўленне» прыроды і абуджэнне прыродных працэсаў пад уплывам сонечнай актыўнасці, адлюстраванне адчування гэтага ў гукавай партытуры сезона.

Асаблівасці слоў, напеву, харэаграфічных рухаў і інструментальнага суправаджэння абранай рэгіянальнай веснавой гульні. Выкананне дэкламацыі слоў і напеву песні-гульні.

*Музычны матэрыял:* песні-гульні «Явар» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Ермала» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Бабка дрэмле» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Воран» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Бацян» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «У катла» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння.

Арнаментальна-драматычная гульня ў веснавы перыяд (3 гадзіны)

Народныя ўяўленні пра тое, як увесну прачынаецца прырода, ярка свеціць сонейка, з'яўляецца першая зяляніна, калі ўжо не трэба апранаць цёплую тоўстую вопратку – надыходзіць час святкаваць разам з прыродай яе абуджэнне: гучна смяяцца, бегаць і гуляць у гульні. Месца абранай рэгіянальнай гульні сярод гульняў, якімі здаўна сустракалі вясну беларусы. Песні-гульні як неад'емная частка гукавай партытуры вясны.

Паўтор дэкламацыі слоў і напеву абранай рэгіянальнай веснавой песні-гульні.

*Музычны матэрыял:* песні-гульні «Явар» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Ермала» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Бабка дрэмле» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Воран» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Бацян» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «У катла» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння.

Валачобная абраднасць (3 гадзіны)

Звесткі пра тое, як на Вялікдзень амаль паўсюль на Беларусі па вёсках і мястэчках хадзілі валачобнікі, якія песнямі, скрыпкай, дудой і барабанам, іншымі музычнымі інструментамі віталі надыход вясны. Уяўленні пра тое, як іх заўсёды чакалі, таму што яны прыносілі ўсім добрае жыццё і долю. Асаблівасці «абыходнай» рытмікі валачобных песень.

Словы, напеў і інструментальнае суправаджэнне абранай рэгіянальнай валачобнай песні. Дэкламацыя слоў і развучванне напеву песні.

*Музычны матэрыял:* песні «А здароў таму, хто ў гэтым даму» (для гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Цэнтральнай Беларусі, Усходняга Палесся і Падзвіння), «Валачобнікі валачыліся» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Цераз садочак» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Хадзілі-блудзілі валачобнікі» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Валачобныя песні (3 гадзіны)

Час, калі дні становяцца ўсё больш светлыя і доўгія і ў сакавіку раўняюцца з ноччу. Веснавое раўнадзенства, пасля якога, калі месяц круглы – ў поўні – на Беларусі здаўна святкавалі Вялікдзень. Выраз пра тое, што «Вялікдзень настае, калі веснавое раўнадзенства сябруе з поўняй Месяца». Склад валачобнай дружыны (зачынальнік, падхватнікі, дудар, скрыпак, механоша). Сувязі тэкстаў песень валачобнікаў з міфалагічнымі матывамі касмагоніі.

Паўтор дэкламацыі слоў і развучвання напеву абранай рэгіянальнай валачобнай песні.

*Музычны матэрыял:* песні «А здароў таму, хто ў гэтым даму» (для гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Цэнтральнай Беларусі, Усходняга Палесся і Падзвіння), «Валачобнікі валачыліся (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Цераз садочак» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Хадзілі-блудзілі валачобнікі» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Драматычная гульня ў веснавы перыяд (3 гадзіны)

Буйныя святы вясны з уласнай драматургіяй: Масленка як карнавальная сустрэча вясны і развітанне з зімой; Загуканне вясны як прыклад адухаўлення сіл адраджэння прыроды; Юр’я як свята пастухоў і супольных вячорак Юраўскай яечні. Адлюстраванне дыялогу з прыродай у напевах веснавых гульняў.

Словы, напеў, харэаграфічныя рухі і інструментальнае суправаджэнне абранай рэгіянальнай веснавой гульні. Дэкламацыя слоў і развучванне яе напеву.

*Музычны матэрыял:* песні-гульні «Юрачка» (для гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Цэнтральнай Беларусі і Падзвіння ), «Чыбір» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Яўтуша» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Воран» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Полька з рожкамі» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Веснавыя песні Беларусі (3 гадзіны)

Неабходнасць надыходу вясны ў народных уяўленнях для забеспячэння існавання ўсяго жывога. «Запрашэнні» вясны ў веснавых песнях. Песні як частка веснавых каляндарных свят. Веснавыя песні як неад'емная частка гукавай партытуры сезона, іх напружанасць, адрасаванасць, гучнае выкананне.

Паўтор дэкламацыі слоў і напеву абранай рэгіянальнай веснавой гульні і валачобнай песні.

*Музычны матэрыял:* песні «Вол бушуе, вясну чуе» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «А вясна-вясняначка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Агу, вясна, агу, красна» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Благаславі, Божа мілы» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «А на гарэ сонца ўстала» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Божа мой, на Юр'я расу» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Веснавыя карагоды (3 гадзіны)

Карагоды як першасная форма каляндарных песень. Перазовы саліста і хору ў запевах і рэфрэнах карагодных веснавых песень.

Словы, напеў, харэаграфічныя рухі абранага рэгіянальнага веснавога карагода. Дэкламацыя слоў і развучванне яго напеву.

*Музычны матэрыял:* песні «Ой, бяроза белая» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Ой, пушчу Стралу» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Правяду Русалачку да бору» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Прэвелы Куста» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «А на гарэ сонца ўстала» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Ой, ты Тройца» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Песні Зялёных Святкаў (3 гадзіны)

Буйная падзея вясны – Зялёныя Святкі, якія надыходзілі на сёмы тыдзень пасля Вялікадня. Святочныя карагоды дзяўчат і жанчын, якія віталі ўрадлівую сілу Маці-Зямлі (Ваджэннем Стралы, Куста, Русалкі, траецкімі песнямі), на якой расце збожжа, дрэвы і трава. Звесткі пра тое, як дзяўчаты падчас Зялёных Святкаў «куміліся» са сваімі лепшымі сяброўкамі – пасля гэтага яны павінны былі заўсёды дапамагаць адна адной. Карагоды як неад'емная частка гукавай партытуры веснавога сезона.

Словы, напеў, харэаграфічныя рухі абранай рэгіянальнай песні Зялёных Святак. Дэкламацыя слоў і развучванне яе напеву.

*Музычны матэрыял:* песні «Ой, бяроза белая» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Ой, пушчу Стралу» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Правяду Русалачку да бору» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Прэвелы Куста» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «А на гарэ сонца ўстала» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Ой, ты Тройца» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Выніковыя заняткі «Вясна на Беларусі» (2 гадзіны)

Падрыхтоўка і дэманстрацыя на школьным свяце праграмы «Вясна на Беларусі», дзе пра веснавыя звычаі, песні, гульні, танцы распавядаюць (па чарзе) вучні, яны ж і дэманструюць тое, што вывучылі на папярэдніх занятках. Вясна як пачатак гаспадарчага года, час, звязаны з уяўленнямі аб крыніцах жыцця і стварэння Сусвету. Удасканальванне навыку харавога калектыўнага музіцыраваня з харэаграфічнымі рухамі.

Рэпертуарны спіс да раздзела

Для рэгіёна Цэнтральнай Беларусі – песня-гульня «Явар», валачобная песня «А здароў таму, хто ў гэтым даму», песня-гульня «Юрачка», веснавая песня «Вол бушуе, вясну чуе», песня «Ой, бяроза белая».

Для Падняпроўя – песня-гульня «Ермала», валачобная песня «Валачобнікі валачыліся», песня-гульня «Чыбір», веснавая песня «А вясна-вясняначка», песня «Ой, пушчу Стралу».

Для Усходняга Палесся – песня-гульня «Бабка дрэмле», валачобная песня «А здароў таму, хто ў гэтым даму», песня-гульня «Яўтуша», веснавая песня «Агу, вясна, агу, красна», песня «Правяду Русалачку да бору».

Для Заходняга Палесся – песня-гульня «Воран», валачобная песня «Цераз садочак», песня-гульня «Воран», веснавая песня «Благаславі, Божа мілы», песня «Прэвелы Куста».

Для Падзвіння – песня-гульня «Бацян», валачобная песня «А здароў таму, хто ў гэтым даму», песня-гульня «Юрачка», веснавая песня «А на гарэ сонца ўстала».

Для Панямоння – песня-гульня «У катла», валачобная песня «Хадзілі-блудзілі валачобнікі», песня-гульня «Полька з рожкамі», юраўская песня «Божа мой, на Юр’я расу», песня «Ой, ты Тройца».

## Фальклорнае мастацтва лета (24 гадзіны)

### Купальскія песні беларусаў (3 гадзіны)

Лета як час, які надыходзіць пасля вясны, калі Сонца па народных уяўленнях «грае»; час найдаўжэйшых дзён і найкарацейшых начэй – Купалле. «Апагей» квітнення прыроды і абуджэнне прыродных працэсаў пад уплывам сонечнай актыўнасці і як наступства – «дагары накіраванасць» інтанавання купальскіх песень.

Асаблівасці слоў, напеву, харэаграфічных рухаў і інструментальнага суправаджэння абранай рэгіянальнай купальскай песні. Выкананне дэкламацыі слоў і напеву песні.

*Музычны матэрыял:* песня «Шла Купалка па вуліцы» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Ой, на Йвана Купала» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «На Івана Купала» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Ой, на Купаллі цёмныя ночы» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Пойдзем, дзеўкі, кругом жыта (Лэго-лэго!)» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Ой, пойдзем, сястрыцы» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

### Купальская песня-карагод (3 гадзіны)

Звесткі пра тое, як у Купальскую ноч па вёсках і мястэчках Беларусі амаль паўсюль палілі вялікія вогнішчы. Звычай, калі хлопцы і дзяўчаты разам вадзілі вакол іх карагоды, танчылі і спявалі да раніцы, а раніцай – сустракалі ўзыход сонца, купаліся ў рацэ, што, па народных павер’ях, прыносіла ўсім добрае жыццё і долю. Купалле – ноч, у якую не спалі і ў якую не змаўкалі песні.

Паўтор дэкламацыі слоў і напеву абранай рэгіянальнай купальскай песні.

*Музычны матэрыял:* песня «Шла Купалка па вуліцы» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Ой, на Йвана Купала» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «На Івана Купала» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Ой, на Купаллі цёмныя ночы» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Пойдзем, дзеўкі, кругом жыта (Лэго-лэго!)» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Ой, пойдзем, сястрыцы» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

### Арнаментальна-драматычная гульня ў летні перыяд (3 гадзіны)

Летнія купальскія ночы – час знаёмстваў, сумесных спаборніцтваў дзяўчат і хлопцаў (як двух паловаў моладзі мясцовай суполкі), у які можна

было прадставіць сябе грамадзе і паглядзець на прадстаўленне іншых. Спецыяльныя гульні, накіраваныя на кантактаванне дзяўчат і хлопцаў, іх знаёмства.

Словы, напеў, харэаграфічныя рухі і інструментальнае суправаджэнне абранай рэгіянальнай купальскай песні-гульні. Дэкламацыі слоў і напеву купальскай песні-гульні.

*Музычны матэрыял:* песня-гульня «Цяцерка (Дуда-весялуха)» (для гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Цэнтральнай Беларусі і Падзвіння), «Царэўна і баяры» (для гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Падняпроўя і Усходняга Палесся), «Молодар» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Проса» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Арнаментальная гульня ў летні перыяд (3 гадзіны)

Рэгіянальныя летнія святы і Купалле – час яднання супольнасці, пазбаўлення ад адзіноты. Наяўнасць уяўленняў пра дэманічную прыроду тых людзей, што хаваюцца ад супольнасці ў гэты час. Шырокае распаўсюджанне калектыўных карагодаў і гульняў у летні перыяд.

Паўтор дэкламацыі слоў і напеву абраных рэгіянальных купальскіх песні-гульні і карагода.

*Музычны матэрыял:* песня-гульня «Цяцерка (Дуда-весялуха)» (для гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Цэнтральнай Беларусі і Падзвіння), «Царэўна і баяры» (для гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Падняпроўя і Усходняга Палесся), «Молодар» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Проса» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Працоўныя песні лета (3 гадзіны)

Сярэдзіна лета – час самых доўгіх дзён і кароткіх начэй. Золак плоднасці прыроды забяспечвае добры ўраджай, які трэба пачынаць збіраць. Збіранне напярэдадні летняга сонцавароту зёлак і лекавых раслін. Парадак, калі адразу пасля летняга сонцавароту пачыналі спачатку касіць сена, потым – жаць жыта, пазней – талакой дажынаць яго і святкаваць разам заканчэнне жніва. Сувязь паміж плоднасцю прыроды і чалавека ў тэкстах працоўных песень.

Паўтор слоў і напеву абраных рэгіянальных купальскіх песні-гульні і карагода.

*Музычны матэрыял:* песня «А ў нашага гаспадара» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Вецярок вее, жыта половее» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Косары косяць» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Ой,

жнея» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «А я ў полі жыта жала» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Перагані, Божа, хмарку» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Песні касавіцы (3 гадзіны)

Пятроўская касавіца як дзея, якая «спадкуе» летняму сонцавароту. Уяўленні пра тое, як неўзабаве пасля яго сонейка высушвае траву і людзі, якія даглядаюць жывёлу, пачынаюць касіць сена. Пад гэтую справу спяваюць спецыяльныя песні, а хлопцаў, якія сёлета першы раз касілі нароўных з дарослымі, упрыгожваюць зялянінай і кветкамі. Пасля гэтага яны лічыліся дарослымі мужчынамі, адбывалася ініцыяцыя хлопцаў у мужчынскую супольнасць.

Словы, напеў, інструментальнае суправаджэнне касарскай песні. Дэкламацыя слоў і напеву песні.

*Музычны матэрыял:* песня «А ў нашага гаспадара» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Вецярок вее, жыта половее» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Косары косяць» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Ой, жнея» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «А я ў полі жыта жала» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Перагані, Божа, хмарку» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Песні жніва і дажынак (3 гадзіны)

Жніўны комплекс свят Зажынкі, Жніво і Дажынкі, аб'яднаных адным напрамкам – зборам зерня (асновы будучага хлеба). Дажынкі як найбольш святочная частка комплекса і ўяўленні пра казлападобнага духа нівы і завіванне яго барады для плоднасці поля. Звычай, па якім, пасля таго як барада завіта, апошні сноп урачыста адносілі гаспадару, які частаваў жней, потым – усе збіраліся разам, святкавалі, танчылі і гулялі ў гульні: радаваліся паспяховаму завяршэнню жніва, паказвалі, што жыццё працягваецца і людзі яго прымаюць весела. Завяршэнне дажынкавага свята, якое пачыналася з завівання «барады». Песні жніўнага часу як неад'емная частка гукавай партытуры лета.

Словы, напеў, харэаграфічныя рухі і інструментальнае суправаджэнне абранай рэгіянальнай песні жніва і дажынак. Дэкламацыя слоў і напеву песні.

*Музычны матэрыял:* песня «А ў нашага гаспадара» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Вецярок вее, жыта половее» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Косары

касяць» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Ой, жнея» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «А я ў полі жыта жала» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Перагані, Божа, хмарку» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Выніковыя заняткі «Лета на Беларусі» (3 гадзіны)

Падрыхтоўка і дэманстрацыя на школьным свяце праграмы «Лета на Беларусі» з элементамі Купалля, Пятроўкі і Жніва, дзе пра летнія звычаі, песні, гульні, танцы распавядаюць (па чарзе) вучні, яны ж і дэманструюць тое, што вывучылі на папярэдніх занятках. Удасканальванне навыку харавога калектыўнага музыцыравання з карагоднымі і танцавальна-харэаграфічнымі рухамі.

Рэпертуарны спіс да раздзела

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі – купальская песня «Шла Купалка па вуліцы», песня-гульня «Цяцерка (Дуда-весялуха)», песня «А ў нашага гаспадара».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя – купальская песня «Ой, на Йвана Купала», песня-гульня «Царэўна і баяры», песня «Вецярок вее, жыта половее».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся – купальская песня «На Івана Купала», песня-гульня «Царэўна і баяры», песня «Касары касяць».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся – купальская песня «Ой, на Купаллі цёмныя ночы», песня-гульня «Молодар», песня «Ой, жнея».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння – купальская песня «Пойдзем, дзеўкі, кругом жыта (Лэго-лэго!)», песня-гульня «Цяцерка (Дуда-весялуха)», песня «А я ў полі жыта жала».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння – купальская песня «Ой, пойдзем, сястрыцы», песня-гульня «Проса», песня «Перагані, Божа, хмарку».

Рэзерв вучэбнага часу (3 гадзіны)

XI КЛАС (105 гадзін)

Фальклорнае мастацтва восені (26 гадзін)

Побытавы танец на восеньскіх кірмашах і фэстах Беларусі (3 гадзіны)

Восень як час, які супадае з замядленнем прыродных біярытмаў і надыходзіць пасля гарачыні лета, калі Сонцу па народных уяўленнях трэба адпачыць, набрацца сіл; дні становяцца карацейшымі, а ночы падаўжаюцца. Сканчэнне працы па ўборцы ўраджаю, калі народ у вёсках і мястэчках Беларусі пачынаў весела і няспешна адпачываць: людзі збіраліся разам, каб паслухаць музыку, спявалі і танчылі на кірмашах і святах ураджаю. Адлюстраванне рэкрэацыйнага настрою ў восеньскім фальклорным рэпертуары.

Побытавы танец «Сто адзін» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Карапет» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Чобаты» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Шэн» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Брычка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Каханачка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння). Нескладанасць і дэмакратычнасць асноўных рухаў вышэйпералічаных танцаў. Іх развучванне пад інструментальны і спеўны (у запісы) акампанемент.

*Музычны матэрыял:* побытавы танец «Сто адзін» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Карапет» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Чобаты» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Шэн» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Брычка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Каханачка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

### Прыпеўкі да побытавага танца (3 гадзіны)

Побытавыя танцы і прыпеўкі да іх з тэкстам пра кірмашовы перыяд. Нескладанасць і дэмакратычнасць асноўных рухаў побытавых танцаў і прыпевак да іх з калектыўным рэфрэнам. Дэкламацыя і спевы па чарзе: «педагог – вучні».

Практыкаванні, у якіх педагог просіць кожнага вучня разам з ім запяваць па чарзе адзін куплет, а падцягваць рэфрэн – усіх. Харавыя дэкламацыі і спевы напеву са словамі прыпевак да абранага рэгіянальнага побытавага танца. Спалучэнне вербальнага тэкста (наступны этап – спеваў) з рухамі.

*Музычны матэрыял:* побытавы танец «Сто адзін» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Карапет» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Чобаты» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Шэн» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Брычка» (для гісторыка-

этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Каханачка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Песні-балады восені (3 гадзіны)

Этнаэкалагічнасць жыцця ў вясковых асяродках, яго размераны рытм. Восеньскі побыт сялян Беларусі, якія адпачываюць ад летняй працы, і іх песні-балады як роздум і назіранне за наваколлем, «пераклíканне» з сезоннымі прыроднымі з'явамі пасля восеньскага раўнадзенства. Восеньскія працоўныя песні і песні-балады (агульная характарыстыка).

Рэгіянальныя балады як прыклад восеньскай лірыкі беларусаў. Дэкламацыя і (як наступны этап) спевы тэкста восеньскай песні.

*Музычны матэрыял:* восеньская песня «Авясец, мамачка, авясец» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Ай, мамачка, восень» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Ой, вы галкі, вы чарненькі» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Восэнь наша доўгая» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся ), «А ці поўна арэхава чашка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Валы мае» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Восеньскія песні беларусаў (3 гадзіны)

Значэнне працы для самазабеспячэння і выхавання чалавека, адлюстраванне працаздольнасці, узаемадапамогі, калектывізма, традыцыйнага права і этыкі ў спеўным рэпертуары беларускіх сялян. Восеньскія працоўныя песні (падрабязнае тлумачэнне: песні пры зборы грэчкі, грыбоў, жніве ярыны, працы ў талацэ) як неад'емная частка этнічных мадэляў паводзін беларусаў. Сувязь працоўных песень з матывамі шлюбу як характэрная з'ява восеньскага рэпертуара.

Дэкламацыя і спевы па чарзе: «педагог – вучні». Практыкаванні, у якіх педагог просіць кожнага вучня разам з ім запяваць па чарзе адзін куплет, а падцягваць рэфрэн – усіх. Выкананне дэкламацыі слоў і напеву рэгіянальнай восеньскай песні. Паўтарэнне прыпевак і рухаў да побытавага танца з папярэдніх заняткаў.

*Музычны матэрыял:* восеньская песня «Авясец, мамачка, авясец» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), Ай, мамачка, восень» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Ой, вы галкі, вы чарненькі» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Восэнь наша доўгая» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся ), «А ці поўна арэхава чашка» (для гісторыка-

этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Валы мае» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Гульня са спевамі і рытмічнымі рухамі (арнаментальная) у восеньскі перыяд (3 гадзіны)

Восеньскі адпачынак у Піліпаўку (падрабязнае тлумачэнне пра пасты, іх медыцынскі і псіхатэрапеўтычны плён для здароўя), праца і хатнія гульні моладзі (агульная характарыстыка), якія яго суправаджалі.

Выкананне дэкламацыі слоў і напеву рэгіянальнай песні-гульні. Суіснаванне і спалучэнне гульняў з песнямі і побытавым танцам у паводзіннай культуры беларусаў. Паўтарэнне слоў і напеву восеньскай песні, прыпевак і рухаў да побытавага танца з папярэдніх заняткаў.

*Музычны матэрыял:* песня-гульня «Бусел» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Каваль» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Вароты»; (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Козлік» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Проса» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Баран» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Гульня з формульным тэкстам і дыялогамі (драматычная) у восеньскі перыяд (3 гадзіны)

Экалогія восені, калі Сонца пачынае свяціць меней і «прысынае» прыроду, таму, як адзначаюць фальклорныя крыніцы, «лісце жаўцее, адлятаюць птушкі. Дні становяцца ўсё карацейшымі. Настае Багач, у які часцяком ладзілі кірмашы». Звесткі пра тое, як на Багач, Міколу па вёсках і мястэчках ладзілі спеўкі і бяседы, дзе песнямі, дудой, скрыпкай і барабанам, іншымі музычнымі інструментамі віталі аднавяскоўцаў. Супольныя бяседы, якіх заўсёды чакалі, таму што яны прыносілі ўсім добры настрой і адпачынак. Піліпаўскі пост і хатнія гульні моладзі (падрабязная характарыстыка: віды працы, гендарная камунікацыя, падрыхтоўка да шлюбу), звязаныя з імі жанры балад і прыпевак да танцаў.

Паўтарэнне слоў і напеву рэгіянальнай восеньскай песні-гульні, слоў і напеву восеньскай песні, прыпевак і рухаў да побытавага танца з папярэдніх заняткаў.

*Музычны матэрыял:* песня-гульня «Ой, лука мая лука» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Пасеялі дзеўкі лён» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Кабыла» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Дрэма» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Юрачка» (для

гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Хустачка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Побытавыя танцы (парныя і з няцотнай колькасцю выканаўцаў) у восеньскіх святах Беларусі (3 гадзіны)

Вясковыя восеньскія фэсты, кірмашы беларусаў, звязаны з імі жанр прыпевак да танцаў. Словы, напеў, харэаграфічныя рухі і інструментальнае суправаджэнне прыпевак да абранага рэгіянальнага побытавага танца.

Выкананне дэкламацыі слоў і напеву прыпевак да абранага рэгіянальнага побытавага танца. Спалучэнне вербальнага тэксту (наступны этап – спеваў) з рухамі. Побытавы танец у спалучэнні з іншымі жанрамі на кірмашах і фэстах. Паўтарэнне слоў і напеву рэгіянальнай восеньскай песні-гульні, слоў і напеву восеньскай песні, прыпевак і рухаў да побытавага танца з папярэдніх заняткаў.

*Музычны матэрыял:* танец «Гапак тройкамі» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), полька «Месяц» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Каробачка тройкамі» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Базар тройкамі» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Лявоніха тройкамі» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Кракавяк у тройках» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Побытавы танец з рознай колькасцю выканаўцаў на восеньскіх вячорках (3 гадзіны)

Супольныя танцавальныя вечарыны беларусаў у восеньскі час. Рэпертуар побытавых танцаў беларусаў, іх вялікая (да 500 найменняў) колькасць і шырокая распаўсюджанасць ва ўсіх рэгіёнах краіны. Звесткі пра мясцовыя побытавыя танцы (вёскі, раёна, гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна), музычныя інструменты, якія іх суправаджалі. Знаёмства (фізічнае ці віртуальнае) з мясцовымі майстрамі танцавальнага фальклору і музыкамі-інструменталістамі.

Паўтарэнне прыпевак і рухаў да побытавых танцаў (парнага і з няцотнай колькасцю выканаўцаў) з папярэдніх заняткаў.

*Музычны матэрыял* танец «Гапак тройкамі» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), полька «Месяц» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Каробачка тройкамі» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Базар тройкамі» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Лявоніха тройкамі» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Кракавяк у тройках» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Выніковыя заняткі «Беларускі кірмаш» (2 гадзіны)

Падрыхтоўка і дэманстрацыя на школьным свяце праграмы «Беларускі кірмаш», дзе пра восеньскія звычаі, песні, гульні, танцы распавядае педагог, а дэманструюць іх – вучні, якія вучылі іх на папярэдніх занятках.

Рэпертуарны спіс да раздела

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі – побытавы танец «Сто адзін», восеньская песня «Авясец, мамачка, авясец», песня-гульня «Бусел», танец «Гапак тройкамі».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя – побытавы танец «Карапет», восеньская песня «Ай, мамачка, восень», песня-гульня «Каваль», полька «Месяц».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся – побытавы танец «Чобаты», восеньская песня «Ой, вы, галкі, вы чарненькі», песня-гульня «Вароты», танец «Каробачка тройкамі».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся – побытавы танец «Шэн», восеньская песня «Восэнь наша доўгая», песня-гульня «Козлік», танец «Базар тройкамі».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння – побытавы танец «Брычка», восеньская песня «А ці поўна арэхава чашка», песня-гульня «Проса», танец «Лявоніха тройкамі».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння – побытавы танец «Каханачка», восеньская песня «Валы мае», песня-гульня «Баран», танец «Кракавяк у тройках».

Фальклорнае мастацтва зімы (26 гадзін)

Зімовыя песні і гульні беларусаў (3 гадзіны)

Зіма як час, які надыходзіць пасля восені, калі Сонцу па народных уяўленнях трэба «развярнуцца на лета»; час самых кароткіх дзён і самых доўгіх начэй у годзе – калядных. Часовае «паміранне» прыроды і згасанне прыродных працэсаў пад націскам халадоў. Доўгі Піліпаўскі пост як прэлюдыя зімы, яго хатнія цырымоніі і гульні (характарыстыка ў кантэксце прадчування Калядаў). Адлюстраванне размеранасці і нетаропкасці перадкаляднага сезона ў напевах і рытміцы зімовых гульняў.

Асаблівасці слоў, напеву, харэаграфічных рухаў і інструментальнага суправаджэння абранай рэгіянальнай зімовай гульні. Выкананне дэкламацыі слоў і напеву песні-гульні.

*Музычны матэрыял:* песня-гульня «Цярэшка» (для гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Цэнтральнай Беларусі і Падзвіння), «Бусел» (для

гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Гарбуз» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Казёл» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Яшчур» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Песні зімовых ігрышчаў (3 гадзіны)

Перадкалядны час, калі ўзімку біярытмы прыроды значна запаволены, Сонца пачынае свяціць меней і прырода засынае. Моладзь, якая чакае Каляды і напярэдадні іх (у Піліпаўку) ладзіць хатнія вечарыны, гульні і ігрышчы. Супольныя «попрадкавая» вечарыны, дзе дзяўчаты рыхтавалі пасаг, і на якія да іх завітвалі хлопцы, каб паразмаўляць і пагуляць.

Паўтор дэкламацыі слоў і напеву абранай рэгіянальнай песні-гульні.

*Матэрыялы:* мультымедыйныя сродкі, выхад у інтэрнэт.

*Музычны матэрыял:* песня-гульня «Цярэшка» (для гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Цэнтральнай Беларусі і Падзвіння), «Бусел» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Гарбуз» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Казёл» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Яшчур» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Песні калядных абыходаў (3 гадзіны)

Каляды як апагей зімовага перыяду, час Крывых вечароў, калі свет карнавалізуецца, Сонца «паварочвае на лета, а зіма – на мароз», звычайны парадак часова адмяняецца, і надыходзяць шумныя і вясёлыя Тры Куцці (прымеркаваныя да Раства – Васілля – Вадохрышча). Адлюстраванне «пераломнасці» сезона ў шумных абыходных песнях-калядках.

Выкананне дэкламацыі слоў і напеву абранай рэгіянальнай каляднай песні.

*Музычны матэрыял:* песня «Цераз поле-лес» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Ай, калядачкі, вы вярніцеся» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «На вашым дварэ» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Колядо, бэгла колядка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «А ў заенькі тры домухны» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Цераз поле-лес ішла Каляда» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Песні-калядкі і песні-шчадроўкі (3 гадзіны)

Варыятыўнасць калядных святкаванняў і песень на Беларусі: Ваджэнне Казы на Падняпроўі і Палессі, Жаніцьба Цярэшкі ў

Цэнтральнай Беларусі і на Падзвінні, Тры Каралі на Панямонні. Звесткі пра мясцовыя калядныя песні-шчадроўкі (вёскі, раёна, гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна), адрозненні іх рэфрэна ад каляднага. Знаёмства (фізічнае ці віртуальнае) з мясцовымі майстрамі спеўнага фальклору.

Асаблівасці слоў, напеву, харэаграфічных рухаў і інструментальнага суправаджэння абранай рэгіянальнай песні-шчадроўкі. Выкананне дэкламацыі слоў і напеву песні. Паўтор слоў і напеву абранай рэгіянальнай каляднай песні

*Музычны матэрыял:* песня «Там на рэчцы на Ярдані» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «За гарою камянною» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Каля коміна» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Ой, Шчодзір-Шчодзір» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Добры вечар вам» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «За варотамі» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Песні калядных хатніх цырымоніяў (3 гадзіны)

Хатнія цырымоніі розных рэгіёнаў Беларусі, месца ў іх мясцовай традыцыі. Парадак: месца, удзельнікі і арганізатары цырымоній (агульная характарыстыка). Асаблівасці іх слоў, напеваў, харэаграфічных рухаў і інструментальнага суправаджэння.

Выкананне дэкламацыі слоў і напеву абранай рэгіянальнай песні-гульні.

*Музычны матэрыял:* песня-гульня «Цярэшка» (для гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Цэнтральнай Беларусі і Падзвіння), «Бусел» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Гарбуз» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Казёл» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Яшчур» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Калядныя містэрыі беларусаў (3 гадзіны)

Тэатралізаваныя каляндарныя дзеі і іх міфалагічная аснова, якая пераводзіць іх у статус дзей-містэрый. Парадак спецыфічных хатніх цырымоній Цэнтральнай Беларусі і Падзвіння («Цярэшкі»): месца, удзельнікі і арганізатары цырымоній (падрабязная характарыстыка); яго суадносіны з мясцовай традыцыяй.

Паўтор дэкламацыі слоў і напеву абранай рэгіянальнай песні-гульні.

*Музычны матэрыял:* песня-гульня «Цярэшка» (для гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Цэнтральнай Беларусі і Падзвіння), «Бусел» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Гарбуз» (для гісторыка-

этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Казёл» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Яшчур» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Песні калядных містэрый (3 гадзіны)

«Лявоніха» як рытуальны танец калядных хатніх цырымоній Цэнтральнай Беларусі і Падзвіння і прыпеўкі да яе. Яе характарыстыка: музычны памер, парна-гуртавы характар, прыпеўкі пад рухі, смыковы і дударскі акампанемент, суадносіны з мясцовай традыцыяй.

Словы, напеў, харэаграфічныя рухі і інструментальнае суправаджэнне песні «Лявоніха».

*Музычны матэрыял:* прыпеўкі да танца «Лявоніха» (рэгіянальныя варыянты).

Гульні і танцы зімовых свят (3 гадзіны)

Калядны карнавал і актыўныя формы адпачынку, якіх ён вымагае. Гульні і танцы як неад’емная частка гукавай партытуры Калядаў.

Паўтор дэкламацыі слоў і напеву абранай рэгіянальнай каляднай песні-гульні, «Лявоніхі», абранай рэгіянальнай песні-калядкі і песні-шчадроўкі.

*Музычны матэрыял:* песня-гульня «Цярэшка» (для гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Цэнтральнай Беларусі і Падзвіння), «Бусел» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Гарбуз» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Казёл» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Яшчур» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Выніковыя заняткі «Беларускія Каляды» (2 гадзіны)

Падрыхтоўка і дэманстрацыя на свяце ўстановы адукацыі праграмы «Беларускія Каляды», дзе пра калядныя звычаі, песні, гульні, танцы распавядаюць (па чарзе) настаўнік і вучні, а дэманструюць – вучні, якія вывучылі іх на папярэдніх занятках. Замацаванне навыку харавога калектыўнага музіцыраваня з харэаграфічнымі рухамі.

Рэпертуарны спіс да раздела

Для рэгіёна Цэнтральнай Беларусі – песня-гульня «Цярэшка», калядная песня «Цераз поле-лес», песня-шчадроўка «Там на рэчцы на Ярдані», прыпеўкі да танца «Лявоніха» (рэгіянальны варыянт).

Для Падняпроўя – песня-гульня «Бусел», калядная песня «Ай, калядачкі, вы вярніцеся», песня-шчадроўка «За гарою камянною».

Для Усходняга Палесся – песня-гульня «Гарбуз», калядная песня «На вашым дварэ», песня-шчадроўка «Каля коміна».

Для Заходняга Палесся – песня-гульня «Казёл», калядная песня «Колядо, бэгла колядка», песня-шчадроўка «Ой, Шчодзір-Шчодзір».

Для Падзвіння – песня-гульня «Цярэшка», калядная песня «А ў заенькі тры домухны», песня-шчадроўка «Добры вечар вам», прыпеўкі да танца «Лявоніха» (рэгіянальны варыянт).

Для Панямоння – песня-гульня «Яшчур», калядная песня «Цераз поле-лес ішла Каляда», песня-шчадроўка «За варотамі», прыпеўкі да танца «Лявоніха» (рэгіянальны варыянт).

## Фальклорнае мастацтва вясны (26 гадзін)

### Веснавыя гульні Беларусі (3 гадзіны )

Вясна як час, які надыходзіць пасля зімы, калі Сонца па народных уяўленнях «ідзе да лета»; час доўгіх дзён і кароткіх начэй. «Аднаўленне» прыроды і абуджэнне прыродных працэсаў пад уплывам сонечнай актыўнасці, адлюстраванне адчування гэтага ў гукавай партытуры сезона.

Асаблівасці слоў, напеву, харэаграфічных рухаў і інструментальнага суправаджэння абранай рэгіянальнай веснавой гульні. Выкананне дэкламацыі слоў і напеву песні-гульні.

*Музычны матэрыял:* Песня-гульня «Пцічкі» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Ермала» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Пава» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Воран» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Мядзвежка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «У катла» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

### Арнаментальна-драматычная гульня ў веснавы перыяд (3 гадзіны)

Народныя ўяўленні пра тое, як увесну прачынаецца прырода, ярка свеціць сонейка, з’яўляецца першая зяляніна, калі ўжо не трэба апранаць цёплую тоўстую вопратку – надыходзіць час святкаваць разам з прыродай яе абуджэнне: гучна смяяцца, бегаць і гуляць у гульні. Месца абранай рэгіянальнай гульні сярод гульняў, якімі здаўна сустракалі вясну беларусы. Песні-гульні як неад’емная частка гукавай партытуры вясны.

Паўтор дэкламацыі слоў і напеву абранай рэгіянальнай веснавой песні-гульні.

*Музычны матэрыял:* Песня-гульня «Пцічкі» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Ермала» (для гісторыка-

этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Пава» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Воран» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Мядзвежка» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «У катла» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Валачобная абраднасць (3 гадзіны)

Звесткі пра тое, як на Вялікдзень амаль паўсюль на Беларусі па вёсках і мястэчках хадзілі валачобнікі, якія песнямі, скрыпкай, дудой і барабанам, іншымі музычнымі інструментамі віталі надыход вясны. Уяўленні пра тое, як іх заўсёды чакалі, таму што яны прыносілі ўсім добрае жыццё і долю. Асаблівасці «абыходнай» рытмікі валачобных песень.

Словы, напеў і інструментальнае суправаджэнне абранай рэгіянальнай валачобнай песні. Дэкламацыя слоў і развучванне напеву песні.

*Музычны матэрыял:* песня «А здароў таму, хто ў гэтым даму» (для гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Цэнтральнай Беларусі, Усходняга Палесся і Падзвіння), «Валачобнікі валачыліся» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Цераз садочак» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Хадзілі-блудзілі валачобнікі» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Валачобныя песні (3 гадзіны)

Час, калі дні становяцца ўсё больш светлыя і доўгія і ў сакавіку раўняюцца з ноччу. Веснавое раўнадзенства, пасля якога, калі месяц круглы – ў поўні – на Беларусі здаўна святкавалі Вялікдзень. Выраз пра тое, што «Вялікдзень настае, калі веснавое раўнадзенства сябруе з поўняй Месяца». Склад валачобнай дружыны (зачынальнік, падхватнікі, дудар, скрыпак, механоша). Сувязі тэкстаў песень валачобнікаў з міфалагічнымі матывамі касмагоніі.

Паўтор дэкламацыі слоў і развучвання напеву абранай рэгіянальнай валачобнай песні.

*Музычны матэрыял:* песня «А здароў таму, хто ў гэтым даму» (для гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Цэнтральнай Беларусі і Падзвіння), «Валачобнікі валачыліся» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Добры дзень таму» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Цераз садочак» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Хадзілі-блудзілі валачобнікі» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Драматычная гульня ў веснавы перыяд (3 гадзіны)

Буйныя святы вясны з уласнай драматургіяй: Масленка як карнавальная сустрэча вясны і развітанне з зімой; Загуканне вясны як прыклад адухаўлення сіл адраджэння прыроды; Юр'я як свята пастухоў і супольных вячорак Юраўскай яечні. Адлюстраванне дыялогу з прыродай у напевах веснавых гульняў.

Словы, напеў, харэаграфічныя рухі і інструментальнае суправаджэнне абранай рэгіянальнай веснавой гульні. Дэкламацыя слоў і развучванне яе напеву.

*Музычны матэрыял:* песня-гульня «Юрачка» (для гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Цэнтральнай Беларусі і Падзвіння), «Чыбір» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Яўтуша» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Воран» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Полька з рожкамі» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Веснавыя песні Беларусі (3 гадзіны)

Неабходнасць надыходу вясны ў народных уяўленнях для забеспячэння існавання ўсяго жывога. «Запрашэнні» вясны ў веснавых песнях. Песні як частка веснавых каляндарных свят. Веснавыя песні як неад'емная частка гукавай партытуры сезона, іх напружанасць, адрасаванасць, гучнае выкананне.

Паўтор дэкламацыі слоў і напеву абранай рэгіянальнай веснавой гульні і валачобнай песні.

*Музычны матэрыял:* песня «Вол бушуе, вясну чуе» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Песенька мая хароша» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Агу, вясна, агу, красна» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Благаславі, Божа мілы» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Благаславі, маці, вясну заклікаці» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Божа мой, на Юр'я расу» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Веснавыя карагоды (3 гадзіны)

Карагоды як першасная форма каляндарных песень. Перазовы саліста і хору ў запевах і рэфрэнах карагодных веснавых песень.

Словы, напеў, харэаграфічныя рухі абранага рэгіянальнага веснавога карагода. Дэкламацыя слоў і развучванне яго напеву.

*Музычны матэрыял:* песня «Ой, бяроза» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Лука» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «На Граной нядзелі Русалкі сядзелі»

(для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Прэвелы Куста» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «А на гарэ сонца ўстала» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Ой, ты Тройца» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Песні Зялёных Святкаў (3 гадзіны)

Буйная падзея вясны – Зялёныя Святкі, якія надыходзілі на сёмы тыдзень пасля Вялікадня. Святочныя карагоды дзяўчат і жанчын, якія віталі ўрадлівую сілу Маці-Зямлі (Ваджэннем Стралы, Куста, Русалкі, траецкімі песнямі), на якой расце збожжа, дрэвы і трава. Звесткі пра тое, як дзяўчаты падчас Зялёных святкаў «куміліся» са сваімі лепшымі сяброўкамі – пасля гэтага яны павінны былі заўсёды дапамагаць адна адной. Карагоды як неад’емная частка гукавай партытуры веснавога сезона.

Словы, напеў, харэаграфічныя рухі абранай рэгіянальнай песні Зялёных Святак. Дэкламацыя слоў і развучванне яе напеву.

*Музычны матэрыял:* песня «Ой, бяроза» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Лука» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «На Граной нядзелі Русалкі сядзелі» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Прэвелы Куста» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «А на гарэ сонца ўстала» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Ой, ты Тройца» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Выніковыя заняткі «Вясна на Беларусі» (2 гадзіны)

Падрыхтоўка і дэманстрацыя на школьным свяце праграмы «Вясна на Беларусі», дзе пра веснавыя звычаі, песні, гульні, танцы распавядаюць (па чарзе) вучні, яны ж і дэманструюць тое, што вывучылі на папярэдніх занятках. Вясна як пачатак гаспадарчага года, час, звязаны з уяўленнямі аб крыніцах жыцця і стварэння Сусвету. Удасканальванне навыку харавога калектыўнага музіцыраваня з харэаграфічнымі рухамі.

Рэпертуарны спіс да раздела

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі – песня-гульня «Пцічкі», валачобная песня «А здароў таму, хто ў гэтым даму», песня-гульня «Юрачка», веснавая песня «Вол бушуе, вясну чуе», песня «Ой, бяроза».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя – песня-гульня «Ермала», валачобная песня «Валачобнікі валачыліся», песня-гульня «Чыбір», веснавая песня «Песенька мая хароша», песня «Лука».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгёна Усходняга Палесся – песня-гульня «Пава», валачобная песня «А здароў таму, хто ў гэтым даму», песня-гульня «Яўтуша», веснавая песня «Агу, вясна, агу, красна», песня «На Граной нядзелі Русалкі сядзелі».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгёна Заходняга Палесся – песня-гульня «Воран», валачобная песня «Цераз садочак», песня-гульня «Воран», веснавая песня «Благаславі, Божа мілы», песня «Прэвелы Куста».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгёна Падзвіння – песня-гульня «Мядзвежка», валачобная песня «А здароў таму, хто ў гэтым даму», песня-гульня «Юрачка», веснавая песня «Благаславі, маці, вясну заклікаці», песня «А на гарэ сонца ўстала».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгёна Панямоння – песня-гульня «У катла», валачобная песня «Хадзілі-блудзілі валачобнікі», песня-гульня «Полька з рожкамі», юраўская песня «Божа мой, на Юр’я расу», песня «Ой, ты Тройца».

## Фальклорнае мастацтва лета (24 гадзіны)

### Купальскія песні беларусаў (3 гадзіны)

Лета як час, які надыходзіць пасля вясны, калі Сонца па народных уяўленнях «грае»; час найдаўжэйшых дзён і найкарацейшых начэй – Купалле. «Апагей» квітнення прыроды і абуджэнне прыродных працэсаў пад уплывам сонечнай актыўнасці і як наступства – «дагары накіраванасць» інтанавання купальскіх песень.

Асаблівасці слоў, напеву, харэаграфічных рухаў і інструментальнага суправаджэння абранай рэгіянальнай купальскай песні. Выкананне дэкламацыі слоў і напеву песні.

*Музычны матэрыял:* песня «Шла Купалка па вуліцы» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгёна Цэнтральнай Беларусі), «Ой, на Йвана Купала» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгёна Падняпроўя), «На Івана Купала» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгёна Усходняга Палесся), «Ой, на Купаллі цёмныя ночы» для гісторыка-этнаграфічнага рэгёна Заходняга Палесся, «Пойдзем, дзеўкі, кругом жыта (Лэго-лэго!)» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгёна Падзвіння,) «Ой, пойдзем, сястрыцы» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгёна Панямоння).

### Купальская песня-карагод (3 гадзіны)

Звесткі пра тое, як у Купальскую ноч па вёсках і мястэчках Беларусі амаль паўсюль палілі вялікія вогнішчы. Звычай, калі хлопцы і дзяўчаты

разам вадзілі вакол іх карагоды, танчылі і спявалі да раніцы, а раніцай – сустракалі ўзыход сонца, купаліся ў рацэ, што, па народных павер'ях, прыносіла ўсім добрае жыццё і долю. Купалле – ноч, у якую не спалі і ў якую не змаўкалі песні.

Паўтор дэкламацыі слоў і напеву абранай рэгіянальнай купальскай песні.

*Музычны матэрыял:* песня «Шла Купалка па вуліцы» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Ой, на Йвана Купала» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «На Івана Купала» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Ой, на Купаллі цёмныя ночы» для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся, «Пойдзем, дзеўкі, кругом жыта (Лэго-лэго!)» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Ой, пойдзем, сястрыцы» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Арнаментальна-драматычная гульня ў летні перыяд (3 гадзіны)

Летнія купальскія ночы – час знаёмстваў, сумесных спаборніцтваў дзяўчат і хлопцаў (як двух паловаў моладзі мясцовай суполкі), у які можна было прадставіць сябе грамадзе і паглядзець на прадстаўленне іншых. Спецыяльныя гульні, накіраваныя на кантактаванне дзяўчат і хлопцаў, іх знаёмства.

Словы, напеў, харэаграфічныя рухі і інструментальнае суправаджэнне абранай рэгіянальнай купальскай песні-гульні. Дэкламацыі слоў і напеву купальскай песні-гульні.

*Музычны матэрыял:* песня-гульня «Цяцерка (Дуда-весялуха)» (для гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Цэнтральнай Беларусі і Падзвіння), «Царэўна і баяры» (для гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Падняпроўя і Усходняга Палесся), «Молодар» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Проса» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Арнаментальная гульня ў летні перыяд (3 гадзіны)

Рэгіянальныя летнія святы і Купалле – час яднання супольнасці, пазбаўлення ад адзіноты. Наяўнасць уяўленняў пра дэманічную прыроду тых людзей, што хаваюцца ад супольнасці ў гэты час. Шырокае распаўсюджанне калектыўных карагодаў і гульняў у летні перыяд.

Паўтор дэкламацыі слоў і напеву абраных рэгіянальных купальскіх песні-гульні і карагода.

*Музычны матэрыял:* песня-гульня «Цяцерка (Дуда-весялуха)» (для гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Цэнтральнай Беларусі і Падзвіння), «Царэўна і баяры» (для гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Падняпроўя і

Усходняга Палесся), «Молодар» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «Проса» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Працоўныя песні лета (3 гадзіны)

Сярэдзіна лета – час самых доўгіх дзён і кароткіх начэй. Золак плоднасці прыроды забяспечвае добры ўраджай, які трэба пачынаць збіраць. Збіранне напярэдадні летняга сонцавароту зёлак і лекавых раслін. Парадак, калі адразу пасля летняга сонцавароту пачыналі спачатку касіць сена, потым – жаць жыта, пазней – талакой дажынаць яго і святкаваць разам заканчэнне жніва. Сувязь паміж плоднасцю прыроды і чалавека ў тэкстах працоўных песень.

Паўтор слоў і напеву абраных рэгіянальных купальскіх песні-гульні і карагода.

*Музычны матэрыял:* песня «А ў нашага гаспадара» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Вецярок вее, жыта половее» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Косары косяць» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Ой, жнея» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «А я ў полі жыта жала» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Перагані, Божа, хмарку» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Песні касавіцы (3 гадзіны)

Пятроўская касавіца як дзея, якая «спадкуе» летняму сонцавароту. Уяўленні пра тое, як неўзабаве пасля яго сонейка высушвае траву і людзі, якія даглядаюць жывёлу, пачынаюць касіць сена. Пад гэтую справу спяваюць спецыяльныя песні, а хлопцаў, якія сёлета першы раз касілі нароўных з дарослымі, упрыгожваюць зелянінай і кветкамі. Пасля гэтага яны лічыліся дарослымі мужчынамі, адбывалася ініцыяцыя хлопцаў у мужчынскую супольнасць.

Словы, напеў, інструментальнае суправаджэнне касарскай песні. Дэкламацыя слоў і напеву песні.

*Музычны матэрыял:* песня «А ўнашага гаспадара» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Вецярок вее, жыта половее» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Косары косяць» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Ой, жнея» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «А я ў полі жыта жала» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Перагані, Божа, хмарку» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Песні жніва і дажынак (3 гадзіны)

Жніўны комплекс свят Зажынкі, Жніво і Дажынкі, аб'яднаных адным напрамкам – зборам зерня (асновы будучага хлеба). Дажынкі як найбольш святочная частка комплекса і ўяўленні пра казлападобнага духа нівы і завіванне яго барады для плоднасці поля. Звычай, па якім, пасля таго, як барада завіта, апошні сноп урачыста адносілі гаспадару, які частаваў жней, потым – усе збіраліся разам, святкавалі, танчылі і гулялі ў гульні: радаваліся паспяховаму завяршэнню жніва, паказвалі, што жыццё працягваецца і людзі яго прымаюць весела. Завяршэнне дажынкавага свята, якое пачыналася з завівання «барады». Песні жніўнага часу як неад'емная частка гукавай партытуры лета.

Словы, напеў, харэаграфічныя рухі і інструментальнае суправаджэнне абранай рэгіянальнай песні жніва і дажынак. Дэкламацыя слоў і напеву песні.

*Музычны матэрыял:* песня «А ў нашага гаспадара» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі), «Вецярок вее, жыта половее» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя), «Косары косяць» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Усходняга Палесся), «Ой, жнея» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся), «А я ў полі жыта жала» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвіння), «Перагані, Божа, хмарку» (для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямоння).

Выніковыя заняткі «Лета на Беларусі» (3 гадзіны)

Падрыхтоўка і дэманстрацыя на школьным свяце праграмы «Лета на Беларусі» з элементамі Купалля, Пятроўкі і Жніва, дзе пра летнія звычаі, песні, гульні, танцы распавядаюць (па чарзе) вучні, яны ж і дэманструюць тое, што вывучылі на папярэдніх занятках. Удасканальванне навыку харавога калектыўнага музіцыраваня з карагоднымі і танцавальна-харэаграфічнымі рухамі.

Рэпертуарны спіс да раздела

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Цэнтральнай Беларусі – купальская песня «Шла Купалка па вуліцы», песня-гульня «Цяцерка (Дуда-весялуха)», песня «А ў нашага гаспадара».

Для гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падняпроўя – купальская песня «Ой, на Йвана Купала», песня-гульня «Царэўна і баяры», песня «Вецярок вее, жыта половее».

Для Усходняга Палесся – купальская песня «На Івана Купала», песня-гульня «Царэўна і баяры», песня «Косары косяць».

Для Заходняга Палесся – купальская песня «Ой, на Купаллі цёмныя ночы», песня-гульня «Молодар», песня «Ой, жнея».

Для Падзвіння – купальская песня «Пойдзем, дзеўкі, кругом жыта (Лэго-лэго!)», песня-гульня «Цяцерка (Дуда-весялуха)», песня «А я ў полі жыта жала».

Для Панямоння – купальская песня «Ой, пойдзем, сястрыцы», песня-гульня «Проса», песня «Перагані, Божа, хмарку».

Рэзерв вучэбнага часу (3 гадзіны)